3. *Дробов, Л. Н.* Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л.Н. Дробов. – Минск : Выш. шк., 1974. – 344 с. : ил.
4. *Ельскі, А.* Адам Міцкевіч на Беларусі / А. Ельскі // Пачынальнікі. – Мінск, 1977. – С. 343.
5. *Мальдзіс, А.* Тры радзімы Ігнацага Дамейкі / А. Мальдзіс. – Мінск : Кантакты і дыялогі, № 7–8, 2002. – 64 с.

***Д. А. Крывашэй,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАЕ КУЛЬТУРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА: ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ (1991–2016)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сістэме міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь асаблівае месца адводзіцца Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Традыцыі культурнага супрацоўніцтва, якія закладзены ў 1950-я гг., працярпелі выпрабаванне часам, прайшлі праз перыяд заняпаду і аднаўлення.

Аналіз дынамікі культурнага супрацоўніцтва незалежнай Беларусі з Кітаем дазваляе нам вызначыць некалькі этапаў.

*Першы этап* ахоплівае 1991–1994 гг. У гэты час пачынае фарміравацца прававая база супрацоўніцтва, аднаўляюцца і наладжваюцца новыя кантакты. У кастрычніку 1991 г. у структуры Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі было створана таварыства «Беларусь-Кітай». 25 лістапада 1992 г. было падпісана міжурадавае пагадненне, а ў 1993 г . – Пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай, якое ахоплівала сферы культуры, мастацтва, выдавецкай справы, сродкаў масавай інфармацыі. Пачалі заключацца дамовы аб пабрацімскіх сувязях паміж гарадамі і рэгіёнамі: г. Мінскам і г. Чанчунем (18 мая 1992 г.), Брэсцкай вобласцю і правінцыяй Хубэй (26 лютага 1994 г.), г. Брэстам і г. Сяоганем (26 сакавіка 1993 г.). У 1992 г. адбыўся візіт у Мінск дэлегацыі газеты «Дзіндзі Жыбао». А ў 1993 г. было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларускім тэлебачаннем і тэлекампаніяй правінцыі Сычуань.

Па прычыне значных праблем як кадравага, так і эканамічнага характару, у гэтыя гады былі рэалізаваны толькі адзінкавыя праекты. Напрыклад, сумесна з кітайскімі калегамі на беларускім тэлебачанні рэалізоўваўся праект «Што ты ведаеш аб КНР?». Ён суправаджаўся серыяй спецыяльных тэлеперадач аб КНР і правінцыі Сычуань.

У ліпені 1994 г. у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, а пазней – у Магілёўскай абласной выставачнай зале дэманстравалася выстаўка твораў мастакоў Тайваня [1].

*Другі этап* уключае 1995–2005 гг. Супрацоўніцтва становіцца больш інтэнсіўным і паслядоўным, атрымлівае развіццё такая яго форма, як Дні культуры (пачынаючы з 1999 г.). У студзені 1995 г. адбыўся першы афіцыйны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Кітай, які разглядаўся як адна з прыярытэтных краін для культурнага супрацоўніцтва. Аб гэтым сведчыць праект канцэпцыі знешняй палітыкі Беларусі ў галіне культуры, які разглядаўся ў кастрычніку 1995 г. на калегіі Міністэрства культуры і друку [5, с. 432–433]. 14 снежня 1995 г. міністэрствы культуры дзвюх краін падпісалі пратакол аб супрацоўніцтве.

У жніўні 1996 г. беларускія кінематаграфісты прадставілі фільм М. Пташука «Гульня ўяўлянняў» на Міжнародным кінафестывалі ў г. Чанчунь [3, с. 6]. У снежні таго ж года кітайскія танцоры прынялі ўдзел у IX Міжнародным фестывалі сучаснай харэаграфіі. У намінацыі «харэаграфічная мініяцюра» ўсе тры прэміі былі прысуджаны калектыву з Кітая [7, с. 18].

У гэты перыяд рэгулярнасць набываюць гастролі беларускіх калектываў у Кітаі: заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь (1996, 1997, 1998, 2000), артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь (1997, 1998), Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» (1998, 2000), Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета Рэспублікі Беларусь (2002, 2003) і іншых [8].

У 1997 г. з арганізацыі выстаўкі кітайскага мастацтва пачалося супрацоўніцтва Гомельскага палаца-паркавага ансамбля з Пасольствам Кітайскай Народнай Рэспублікі [2].

У 2001 г. у Пекіне быў адкрыты карэспандэнцкі пункт газеты «Советская Белоруссия». З 2003 г. ў Кітая пачаў працаваць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўнік тэлекампаніі АНТ [4, с. 57]. У 2004 г. быў падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Кітая. У 2005 г. заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Прэс-канцылярыяй Дзяржаўнага Савета Кітайскай Народнай Рэспублікі.

*Трэці этап* ахоплівае 2006–2012 гг. Супрацоўніцтва вызначаецца сістэмным і разнастайным характарам. Пасля афіцыйнага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ў снежні 2005 г. у Кітай адносіны з гэтай краінай сталі разглядацца як стратэгічнае партнёрства. Пры гэтым культура павінна была стаць адной з яго складовых частак. Праграмай актывізацыі беларуска-кітайскіх адносін на 2006–2010 гг. была прадугледжана рэалізацыя шэрагу мерапрыемстваў у галіне культуры. Напрыклад, у ліпені 2006 г. кітайскія артысты ўпершыню прынялі ўдзел у Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», у снежні 2006 г. пры БДУ быў заснаваны Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя. У 2007 г. у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце пры падтрымцы пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі быў адкрыты Кітайскі культурна-адукацыйны цэнтр «Шанхай-2007». У лістападзе 2007 г. быў падпісаны міжведамасны пратакол аб супрацоўніцтве на 2007–2011 гг., заключана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж універсітэтам г. Чжэньчжоу і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі.

В 2012 г. асобныя дзяржаўныя выдавецтвы Беларусі былі прадстаўлены на Міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы ў Пекіне.

*Чацвёрты этап* у развіцці беларуска-кітайскага культурнага супрацоўніцтва пачаўся ў 2013 г. Ён характарызуецца значнай актывізацыяй дзейнасці ў напрамку пашырэння нарматыўна-прававой базы культурнага супрацоўніцтва, стварэннем і дзейнасцю адмысловых міжурадавых структур. Адметнасцю гэтага этапу стала стварэнне асобных культурных цэнтраў.

У ліпені 2013 г. у рамках афіцыйнага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Кітай падпісана праграма супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры Беларусі і бюро па кінематаграфіі Галоўнага дзяржаўнага ўпраўлення па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КНР, заключана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Пекінскай сталічнай бібліятэкай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, пагадненне паміж саюзамі пісьменнікаў.

У кастрычніку 2014 г. былі падпісаны мемарандумы аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам культуры Беларусі і Міністэрствам культуры Кітая, па пытаннях супрацоўніцтва паміж Галоўным дзяржаўным упраўленнем па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання КНР і Міністэрствам інфармацыі Беларусі.

Нацыянальны мастацкі музей заключыў пагадненні аб супрацоўніцтве з Музеям сучаснага еўрапейскага жывапісу г. Цяньдзіня (2013) і Дзяржаўным музеям імператарскага палаца Гугун у Пекіне (2014). Пагадненне з Цэнтральным тэлебачаннем Кітая «CCTV» заключыла Белдзяржтэлерадыёкампанія (2013).

У студзені 2014 г. абвешчана аб рэалізацыі Праграмы развіцця ўсебаковага стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая на 2014–2018 гг. Яе важная частка – абнаўленне Міжурадавага камітэта па супрацоўніцтву, у складзе якога з'явіліся камісіі па адукацыі, культуры і бяспецы. Першае пасяджэнне беларускай часткі Камісіі па культурнаму супрацоўніцтву Беларуска-Кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтву адбылося 15 снежня 2014 г. у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

У лютым-сакавіку 2014 г. адбыліся першыя ў гісторыі гастролі беларускага тэатра ў Кітаі – у Пекіне выступіў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Купалаўцы адкрывалі Пекінскі вясновы тэатральны фестываль. На сцэне Народнага мастацкага тэатра Пекіна ім былі прадстаўлены два спектаклі – «Вяселле» па А. Чэхаву і «Не мой» па А. Адамовічу. Кожную пастаноўку паказалі па тры разы. Дагэтуль у Кітаі бачылі толькі беларускі балет [3].

У адпаведнасці з падпісаным у маі 2015 г. Міжурадавым пагадненнем аб узаемным заснаванні культурных цэнтраў такія ўстановы былі адкрыты ў г. Мінск (21 снежня 2016 г.) і г. Пекін (30 мая 2017 г.).

У 2015 г. Кітай быў ганаровым госцем XXII Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу. У ходзе яе быў падпісаны Праект перакладу і публікацый класічных літаратурных твораў Кітая і Беларусі на 2015–2020 гады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Барысевіч, Ю.* Спатканне з тайваньскім жывапісам / Ю. Барысевіч // Культура. – 1994. – 4 мая. – С. 3.

2. Важнейшие события в дипломатических отношениях Республики Беларусь и Китайской Народной Республики // Гомельский дворцово-парковый ансамбль. [Электронный ресурс]. – 2011. – Режим доступа: http://www.palacegomel.by/index.php?newsid=914&post=-28698414_57. – Дата доступа: 12.06.2017.

3. «Вяселле» і «Не мой» – гастролі ў Пекіне [Электронны рэсурс] // Афіцыйны інтэрнет-сайт Нацыянальнага Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. – Рэжым доступу: http://kupalauski.by/teatr/tours/on-tour-in-china/. – Дата доступу: 11.11.2017.

4. *Дубовик, В. С.* Беларусь – Китай: на пути всестороннего сотрудничества / В. С. Дубовик. – Минск : Звязда, 2015. – 104 с.

5. *Крывашэй, Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991–2010 гг.) / Д. А. Крывашэй. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 521 с.

6. Культурнае жыццё Беларусі (хроніка падзей). Жнівень, 1996. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 1996. – 20 с.

7. Культурнае жыццё Беларусі (хроніка падзей). Снежань, 1996. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 1997. – 28 с.

8. Сотрудничество в области культуры [Электронный ресурс] // Белорусско-китайский межправительственный комитет по сотрудничеству. – Режим доступа: http://www.belaruschina.by/ru/belarus_china/ relations/ present/humanitarian/sotrudnichestvo-v-oblasti-kultury.html. – Дата доступа: 12.06.2017.

***П. М. Кушнерик,*** *старший преподаватель кафедры русского языка как иностранного Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ЛЕКСИКО-ГРАММАТИЧЕСКОГО МАТЕРИАЛА ПРИ ОБУЧЕНИИ РУССКОМУ ЯЗЫКУ КАК ИНОСТРАННОМУ СТУДЕНТОВ 1–2 КУРСОВ

В подаче лексико-грамматического материала необходимо идти от наблюдения конкретных примеров – типа тех, что даны в начале каждого параграфа в учебнике, – к выводам.

При анализе записанных на доске предложений необходимо активизировать учащихся. Нужно не объяснять, а опираясь на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ